А. Ф. В і ш н е ў с к і

ТЭАРЭТЫК УТЫЛІТАРЫЗМУ І. БЕНТАМУ КРЫЧАЎСКІМ СТАРОСТВЕ

Вішнеўскі Аляксей Фёдаравіч *– прафесар кафедры тэорыі і гісторыі праваўстановы адукацыі «БІП – Універсітэт права і сацыяльна-інфармацыйныхтэхналогій», доктар гістарычных навук, прафесар права.* *Сфера навуковыхінтарэсаў: тэарэтыка-прававыя і гісторыка-прававыя праблемы. На падставе аналізу літаратурных крыніц, твораў І. Бентама характарызуюцца яго поглядына праблемы правазнаўства і дзяржавазнаўства. Звяртаецца ўвага на тое, што крычаўскі перыяду палітыка-прававой спадчыне І. Бентама быў адным з самых плённых. Менавіта ў маёнтку князяР. А. Пацёмкіна ў вёсцы Задабрасць мысліцель падрыхтаваў свае найбольш значныя працы: «Абарона ліхвярства», «Паноптыкум», «Уводзіны ў асновы маральнасці і заканадаўства» і інш. Адзначаецца, што І. Бентам займаўся не толькі прапагандай сваіх поглядаў і ідэй па ўдасканаленні дзяржаўнаарганізаванага грамадства, але і шукаў магчымасці ўкаранення іх у жыццё.*

Уводзіны

Апошняя трэць XVIII ст.– час, калі Англія хутка пераўтваралася па галоўных паказчыкахграмадскага развіцця ў вядучую капіталістычную дзяржаву свету. Англійская палітыка-прававаядумка па-свойму апісвала, тлумачыла і апраўдвала буйныя сацыяльна-гістарычныя перамены, што адбываліся ў краіне. У грамадазнаўстве цэнтральнай стала тэма дабратворнай ролі прыватнай уласнасці, яе абароны і падтрымкі, тэма актывізму індывіда, гарантый недатыкальнасцісферы прыватнай жыццядзейнасці людзей і інш. У развіццё гэтых уяўленняў значны ўнёсакзрабіў Іерамія (Джэрэмі) Бентам (1748–1832) – брытанскі філосаф, юрыст, самы вядомы тэарэтык утылітарызму, які прапанаваў прынцып карысці (дабра, шчасця) у якасці вызначальнага крытэрыю ацэнак сацыяльных з’яў. Вывучаў юрыспрудэнцыю ў Оксфардзе (1760–1763), дзеатрымаў вучоную ступень магістра. Пасля заканчэння ўніверсітэта і Лонданскай адвакацкай школы Бентам адмаўляецца ад прэстыжнай кар’еры адваката і ў далейшым пераважна займаецца навуковай і публіцыстычнай дзейнасцю. І гэта нягледзячы на тое, што адвакацкая прафесіялічылася фамільнай, пераходзіла з пакалення ў пакаленне. Навуковыя інтарэсы Бентама ўражваюць сваёй шырынёй. Яго полем дзейнасці сталіпраблемы тэорыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага, грамадзянскага, крымінальнага права судаўладкавання і міжнароднага права, метадалогіі юрыспрудэнцыі. Ідэі мысліцеля па адзначаных кірунках адрозніваюцца імкненнем да абнаўлення і гуманізацыі заканадаўства, павышэння яго эфектыўнасці з мэтаю служэння дзяржавы і права карысці і шчасцю чалавецтва.Творчая спадчына Бентама ў галіне права прадугадала школу юрыдычнага пазітывізму,якая заняла вядучае месца ў другой палове XIX – першай палове XX ст. Мысліцельправазнаўца характарызаваў свой метад даследавання дзяржаўна-прававой рэальнасці як спробу прыўнесці ў пазнанне сацыяльных навук метады, якія прымяняліся ў эксперыментальнай

фізіцы. А паколькі навука можа пазнаваць толькі тое, што даступна эмпірычнамуаналізу, то юрыдычны пазітывізм як напрамак прававой думкі атаясамлівае права з законамнезалежна ад зместу апошняга. Пазітывісты ў асобе Бентама і яго прыхільнікі грунтаваліся на класічным утылітарысцкімразуменні права, прызначэнне якога, з іх пункту гледжання, – служыць рэалізацыі канкрэтныхпрактычных сацыяльных мэтаў, садзейнічаць атрыманню людзьмі матэрыяльнай і іншайвыгады, карысці для сябе.На вялікі жаль, да сённяшняга часу адсутнічаюць працы, прысвечаныя старонкам творчага жыцця Бентама ў Беларусі. Больш за тое, нават калі і згадваецца факт яго знаходжанняў Расіі, то незразумела, у якім рэгіёне імперыі, не ўказваюцца прычыны прыезду мысліцеляў былое Вялікае Княства Літоўскае, дакладны час яго знаходжання тут, якія найбольш значныя працы падрыхтаваныя ім на землях Беларусі. На некаторых з названых пытанняў аўтар артыкула мяркуенеабходным хаця б канспектыўна спыніцца. Пры гэтымадзначым, што кароткі гістарыяграфічны аналіз ідэй мысліцеля дадзены намі ў артыкуле «Крычаўскі перыяду палітыка-прававой спадчыне І. Бентама»1. Што тычыцца беларускіх навукоўцаў, то толькі ў апошняе дзесяцігоддзе імі згадваецца факт знаходжанняў Беларусі І. Бентама. Так, напрыклад, даследчыкі А. П. Мельнікаў і С. Ф. Сокал у сваёй працы«Гістарычныя этапы станаўлення і развіцця палітычных тэорый і вучэнняў» удзялілі ўвагумысліцелю і коратка ахарактарызавалі яго ўнёсак у палітыка-прававую спадчыну, «посколькужизнь и деятельность Бентама были связаны в какой-то мере с Беларусью».

Асноўная частка

У сувязі з першым падзелам Рэчы Паспалітай у 1772 г. усходняя частка беларускіх зямель увайшла ў склад Расійскай імперыі. Далучаныя ўладанні Кацярына II раздала найбольш набліжаным да яе асобам. Прэзідэнту ваеннай калегіі Святлейшаму князю Таўрычаскаму Р. А. Пацёмкіну, аднаму з найбольш уплывовых фаварытаў імператрыцы, дасталася Крычаўскае староства разам з 14274 прыгоннымі сялянамі. Пры новым уладальніку Крычаў становіцца буйным цэнтрам суднабудавання. Менавіта тут у 1785 г. стварылі цэлую флатылію для падарожжа Кацярыны II у Наваросію. Па ініцыятыве Пацёмкіна быў адчынены шэраг мануфактурных прадпрыемстваў: гарбарных, канатных, шкляных, а так сама вінакурні, млыны і інш. У сувязі з тым, што праца на адзначаных прадпрыемствах патрабавала не толькі мясцовай працоўнай сілы, але і спецыялістаў-прафесіяналаў, то ўладар Крычава зрабіў стаўку і на замежныя кадры. Сярод іншых у 1783 г. сюды прыбыў Сэмюэль Бентам – вядомы ў Англіі інжынер-механік і суднабудаўнік – малодшы брат Іераміі Бентама. Цікава адзначыць, што перад паездкай у Расію Сэмюэль заручыўся 86 рэкамендацыйнымі лістамі, а каб прывыкнуць да таго стылю жыцця, які, як меркаваў ён, мог яго чакаць, на працягу трох тыдняў спаў толькі на падлозе. Паводле другіх дадзеных, Сэмюэль на службу да князя Пацёмкіна прыйшоў значна раней, у 1774 г. і даслужыўся ў Расіі да генеральскага чына. Мяркуем, што гэта малаверагодна, таму што ў 1774 г. нават старэйшаму брату Іераміі было

ўсяго 26 гадоў, а малодшаму яшчэ менш. Таму тое, што магчыма быць «вельмі вядомым інжынерам-механікам і суднабудаўніком» у зусім маладым узросце, выклікае вялікае сумненне. Задумаўшы насадзіць у Беларусі заходнееўрапейскую цывілізацыю, Пацёмкін прызначае Сэмюэля Бентама адным з выканаўцаў сваёй волі: стварыць у Крычаве «прамысловы і гандлёвы цэнтр, падобны да такіх жа заходнееўрапейскіх цэнтраў». Таму абавязкаў, ускладзеных на яго, было вельмі шмат. Ён,– пісаў пра брата Іерамія Бентам,– павінен быў выступіць «як будаўнік караблёў, канатны майстар, парусных спраў майстар, вінакур, півавар, садоўнік… каваль і меднік» .Вось як характарызуе Сэмюэль мясціны, дзе яму выпала жыць, і насельніцтва, з якім даводзілася кантактаваць: «Месцазнаходжанне маляўнічае і прыемнае, людзі ціхія і неверагодна цярплівыя, хоць адны працавітыя, а другія – гультаі і п’яніцы». А ў сувязі з тым, што насельніцтва Крычава складалі не толькі беларусы, але і расійцы, немцы, яўрэі і іншыя этнічныя групы, то Бентам адзначаў: «спачатку мае англійскія вушы ніяк не маглі прызвычаіцца да гэтай какафоніі». Яўрэі, у якіх даводзілася купляць усё неабходнае, гаварылі на ідыш, таму «ў кірмашовыя дні, апынуўшыся ў самай сярэдзіне гэтага гармідару дзівацкіх твараў і вопратак, я часта пытаўся ў сябе, якім ветрам мяне сюды занесла». Як сведчаць гістарычныя крыніцы, у пачатку 1785 г. Іерамія Бентам па запрашэнні малодшага брата вырашыў здзейсніць падарожжа ў Расію і далучыцца да Сэмюэля. Па просьбе князя Пацёмкіна Іерамія сабраў звесткі аб магчымых прагрэсіўных зменах у сельскай гаспадарцы і прамысловасці. Сам мысліцель, выконваючы даручэнні вяльможы, ехаў у Расію як прыватная асоба, якая была запрошана на пасаду кансультанта па паляпшэнні спраў «у галіне земляробства, садаводства, мануфактуры і гандлю». З сабою ён прывёз батаніка і дзвюх жанчын, якія добра ведалі малочную гаспадарку. Адправіўшыся ў пачатку жніўня 1785 г. з Англіі, Іерамія наведаў Францыю, Фларэнцыю, Канстанцінопаль і праз Балгарыю сухапутным шляхам прыбыў у Магілёўскую губерню. Сваім месцазнаходжаннем Іерамія Бентам абраў маёнтак у вёсцы Задабрасць (з 1939 г.– Калініна), што недалёка ад Крычава. Тут ён меў магчымасць лепш азнаёміцца з жыццём простых людзей і быць бліжэй да аб’ектаў сельскагаспадарчых доследаў. Месца і ўмовы для творчай працы правазнаўцы, філосафа і сацыёлага аказаліся вельмі спрыяльнымі. «Тут у Крычаве,– пісаў І. Бентам,– дакладней у нашым катэджы за тры мілі ад гарадка, дзе я зараз жыву, у сутках не 24 гадзіны, а нашмат больш». Задабрасць знаходзілася каля рэчкі Дабрасць, да якой Бентам часта хадзіў на прагулку пяшком. Сяляне лагодна звалі яго паміж сабой Ярэмай-немцам. І не толькі яго: простыя людзі ўсіх, хто не разумеў іх мовы, звалі немцамі. Непрыкметна для Бентама «жартуючы і дурачыся, сяляне параўноўвалі сваю лапцяную абуўку з дабротнымі англійскімі чаравікамі і панчохамі, што шчыльна абцягвалі лыткі іншаземца». Спачатку мысліцель сумаваў па радзіме, але паступова прывык і нават па-свойму палюбіў і снежную зіму, і спякотныя летнія дні, якіх не вельмі багата ў Англіі. У перыяд знаходжання ў Задабрасці кансультанцкая дзейнасць адымала няшмат часу ў Бентама, таму

ён цалкам прысвяціў сябе даследаванню палітыка-прававых праблем сучаснай яму Еўропы. Менавіта тут на працягу 20 месяцаў Іерамія Бентам напісаў такія вядомыя творы, як «Абарона ліхвярства», знайшоў ідэю «Паноптыкума» і напісаў аднайменны трактат, падрыхтаваў да друку «Рацыянальную аснову ўзнагарод» і першапачатковы варыянт «Уводзін у асновы маральнасці і заканадаўства». У іншых крыніцах гэтая праца выступае пад назвай «Уводзіны ў прынцыпы маралі і заканадаўства». Па хадайніцтве бацькі Бентама навуковая праца «Абарона ліхвярства» выйшла ў свет у пачатку 1787 г. і мела вялікі поспех. Яна была перакладзена на іншыя еўрапейскія мовы і стала прадметам абмеркавання не толькі юрыстаў, але перш за ўсё эканамістаў у цэлым шэрагу краін. Сам Адам Сміт, крытыцы поглядаў якога часткова была прысвечана праца, адгукаўся пра яе больш чым спагадліва. Сэнс сказанага вялікім эканамістам можна перадаць у наступных словах: хоць у адносінах да мяне зроблена некалькі суровых удараў, «даны яны ў такой прыгожай форме, што на іх нельга скардзіцца і можна, здаецца, дапусціць, што яны справядлівыя». Больш за тое, разам з паведамленнем аб смерці А. Сміта, Іерамія атрымаў ад вялікага эканаміста экзэмпляр вядомай на ўвесь свет працы «Багацце народаў». На думку Бентама, нарматыўныя прававыя акты, якія абмяжоўваюць велічыню працэнта на даваемыя ў пазыку грошы, не могуць быць апраўданы ні з юрыдычнага, ні з эканамічнага пункту гледжання. «Ні адзін чалавек, які дасягнуў разумнага ўзросту і душэўна здаровы, які дзейнічае цалкам свабодна і з веданнем усіх абставін справы, не павінны сустракаць перашкод пры заключэнні якіх яму патрэбна умоў пры атрыманні грошай у пазыку; роўным чынам нікому не трэба замінаць уступаць з такім чалавекам у дагавор пазыкі на ўмовах, якія будуць знойдзены пажаданымі»1. Акрамя таго, лічыў Бентам, законы, якія абмяжоўваюць велічыню працэнта, шкодна ўплываюць на грамадства як у адносінах яго матэрыяльнага, так і маральнага багацця. Таму мае рацыю даследчык А. М. Астраух, якая ў сваёй дысертацыі і іншых працах падае аналізуемую кнігу пад назвай «Абарона ліхвярскіх працэнтаў». Адной з апошніх найбольш значных прац Бентама, якая выйшла ў свет у 1789 г. пад рэдакцыяй самога мысліцеля-правазнаўцы і філосафа, былі «Уводзіны ў асновы маральнасці і заканадаўства». Але названая праца спачатку вялікага поспеху не мела. Як падкрэслівае П. Пакроўскі, «цяжка было дасягнуць поспеху для сур'ёзнага, філасофска-прававога сачынення, разлічанага на многія гады, у тую эпоху, калі ўвага грамадства была цалкам прыкавана да падзеяў, якія разгортваліся ў Францыі (маецца на ўвазе Вялікая французская рэвалюцыя – А. В.)». Пазней кніга была ацэнена вельмі высока як юрыстамі, так і філосафамі. Ідэя «Паноптыкума» належала Сэмюэлю Бентаму. Справа ў тым, што па яго запрашэнні ў Крычаў з Англіі прыехалі больш за дваццаць гэтак званых спецыялістаў. Галоўнай праблемай для Сэмюэля было тое, што ў апошніх адчуваўся недахоп элементарнай дысцыпліны. «Лянота, крадзяжы, п'янства і сэксуальная разбэшчанасць сталі неад'емнай часткай жыцця заморскіх гасцей. Яны аказаліся ні на што няздатным натоўпам, які пры гэтым патрабаваў высокіх заробкаў». У выніку інжынер задумаў

распрацаваць такі праект вытворчага памяшкання, у якім кіраўнік змог бы пастаянна назіраць за рабочымі, застаючыся пры гэтым незаўважаным. На падставе ідэй малодшага брата Іерамія насамрэч падрыхтаваў праект установы, якая магла быць як вытворчага, так і турэмнага тыпу, у якой можна было пастаянна назіраць за людзьмі. Па сутнасці гэты праект можна было выкарыстаць пры будаўніцтве і іншых памяшканняў, у якіх канцэнтравалася вялікая колькасць людзей: мануфактурах, фабрыках, следчых ізалятарах і інш. Паноптыкум (са старажытна-грэцкай – «усё бачна») як турэмны тып будынка ўяўляў сабою колападобнае, з вежай у цэнтры памяшканне. Яно дзялілася на камеры, якія наскрозь праглядаліся, таму што ў іх прадугледжана было два акны: адно выходзіць унутр (насупраць адпаведнага акна вежы), а другое – на двор. Супрацоўнік аховы знаходзіўся ў вежы, але заставаўся нябачным для асуджаных, у якіх узнікала адчуванне пастаяннага кантролю. Такім чынам, яны з цягам часу становяцца ідэальнымі вязнямі, і зыходзячы з прынцыпаў тэорыі ўтылітарызму фізічны прымус у такіх умовах быў не патрэбны. Людзі не толькі прымалі такія ўмовы ўтрымання, але хутка прыстасоўваліся і ўспрымалі іх як звычайную штодзённасць. Можна пагадзіцца з тым, што на праект паноптыкума паўплывала рэчаіснасць, якую браты Бентамы змаглі назіраць у Крычаўскім старостве. Пазней Іерамія пісаў, што ідэю праекта такой турмы яго малодшы брат Сэмюэль запазычыў з манеры пабудовы беларускіх сялянскіх хат. На яго думку, у такіх памяшканнях нагляд быў бы простым, зручным і бесперапынным. У 1787 г. Бентамы вымушаны былі пакінуць уладанні Пацёмкіна, якія ён прадаў за 900 тыс. рублёў мясцоваму землеўладальніку Яну Галынскаму, які на той час займаў пасаду мсціслаўскага ваяводы. Такім чынам, ажыццявіць свой праект браты не паспелі. Аднак ідэя паноптыкума не прапала. Як вядома, Пацёмкіну так і не ўдалося «перасадзіць» заходнееўрапейскую, у прыватнасці англійскую, культуру ў Беларусі. Вопыт не прывіўся. Няведанне мовы мясцовага насельніцтва, недахоп неабходнай навуковай літаратуры, іншых крыніц палітыка-прававога характару абцяжарвалі Бентаму рэалізацыю многіх задумак. Пакінуўшы маёнтак Задабрасць у лістападзе 1787 года, І. Бентам вяртаўся на радзіму праз Польшчу, Прусію, Галандыю і быў у Англіі ў 1788 годзе. Да сябе на радзіму ён прывёз значную колькасць пасяўнога матэрыялу розных сельскагаспадарчых культур, а таксама гісторыі пра далёкую, халодную і лясістую краіну, у якой мядзведзі, ваўкі, кабаны, ласі і іншыя дзікія жывёліны бадзяюцца ледзь не па вясковых вуліцах. Па дарозе назад ад англійскага пасланніка ў Гаазе ён атрымаў экзэмпляр сваёй кнігі «Абарона ліхвярства», якая была падрыхтавана вучоным у маёнтку Задабрасць. У кантэксце сказанага адзначым, што ў найбольш значных працах, якія Бентам падрыхтаваў у Задабрасці, і ў тых, якія былі напісаны пасля яго вяртання ў Англію, знайшла адлюстраванне расійская рэчаіснасць: сацыяльна-эканамічная, палітычная, духоўная, прававая. Таму можна выказаць меркаванне, што няма падстаў спрашчаць прычыны складанага падарожжа тэарэтыка утылітарызму толькі да наведвання малодшага брата ў Крычаве. Дарэчы, і сам тэрмін знаходжання на Магілёўшчыне – каля двух

гадоў – сведчыць аб нейкай іншай прычыне. На наш погляд, мае права на жыццё версія, што паездка Бентама на ўсход былога ВКЛ звязана з геапалітычнымі зменамі ў Еўропе. Менавіта першы падзел у 1772 г. адной з самых буйных краін у свеце – Рэчы Паспалітай – паміж Расійскай імперыяй, Аўстрыяй і Прусіяй прывёў да парушэння не толькі міжнароднага права, але і фарміравання геапалітычнага баланса сіл на кантыненце. Таму для сацыёлага, правазнаўцы, філосафа такога маштабу, які меў Бентам, акунуцца ў абстаноўку рэальных змен, якія адбываліся ці маглі адбывацца ў сацыяльна-палітычным і прававым жыцці, было своечасова і важна. Тым больш, што гэта адбывалася на мяжы ўсходняй і заходняй еўрапейскіх цывілізацый. Важна было ўбачыць дыфузію прававых ідэй, правапрымяняльнай практыкі, асабліва на падставе рэалізацыі першых наказаў Кацярыны II. Справа ў тым, што мадэрнізацыя – гэта не толькі новая канструкцыя, але і рэканструкцыя розных бакоў грамадскай сістэмы: сацыяльнай, палітычнай, эканамічнай, духоўнай. Таму, задумаўшы насадзіць на ўсходніх беларускіх землях элементы заходнееўрапейскай цывілізацыі, стварыць паказальную гаспадарку, значную колькасць насельніцтва якой складалі б перасяленцы з Англіі, князь Пацёмкін быў несвабодны ў сваіх дзеяннях, ды і сам ён быў дзіцём свайго часу: панавання ў Расіі феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Кацярынінская мадэрнізацыя, таксама як і пятроўская, па сваёй сутнасці была азіяцкай, паколькі яна прадугледжвала ўкараненне прамысловай вытворчасці і рынку пры захаванні грамадскіх адносін усходняга тыпу. Нягледзячы на тое, што палітыка Кацярыны II і атрымала назву «асветны абсалютызм», а сама царыца заўсёды падкрэслівала, што кніга Мантэск'е «Аб духу законаў» стала яе правадніком у палітыцы, імператрыца не бачыла каштоўнасці ў дэмакратыі, яе мэтай было без адмовы ад гістарычнай традыцыі ператварыць дзяржаву ў механізм паскоранага развіцця, што ў выніку прывяло да ўзмацнення абсалютызму. Таму і знешняя экспансія насіла ўсходні характар. Расія не стала метраполіяй, далучаныя тэрыторыі ўключаліся ў склад адзінай дзяржавы, пра што сведчыць і расійскае заканадаўства. Звяртае ўвагу на сябе тое, што ў першыя гады пасля анексіі часткі зямель былога ВКЛ не адбылося поўнай адмены дзеючага на дадзенай тэрыторыі права і замены яго расійскімі законамі. Галоўнай крыніцай права заставаўся Статут ВКЛ 1588 г. Па сутнасці, мела месца прававая інтэграцыя, «калі мясцовае права ўключалася ў права каланізатара ва ўсіх сферах, дзе не існавала яўных супярэчнасцей»1. У якасці доказу прывядзем п. 12 і п. 18 наказа «Кацярына II генерал-маёрам Кахоўскаму і Крачэтнікаву… аб адпраўленні пасад губернатараў у губерні Пскоўскай і Магілёўскай» ад 28 мая 1772 г.: п. 12 «Суд и расправа внутренние тех провинций в личных делах имеют производиться по их законам и обыкновениям и их языком во всех тех случаях, кои не дотрагиваются до власти нашей»; п. 18 «Города оставьте на их правах и привилегиях на первый случай, и каждому из них не препятствуйте просить у нас о подтверждении сих». Такое становішча пацвярджалася «Указом Екатерины II, данным белорусскому генерал-губернатору графу Чернышеву»

ад 16 жніўня 1772 г., але з істотнымі агаворкамі: п. 6 «Суд и расправу велеть до времени производить в настоящих судебных местах по тамошним правам и обычаям, но нашим уже именем и властию». Такім чынам, згодна наказу Кацярыны II ад 28 мая 1772 г. прадпісвалася захаваць для мясцовага насельніцтва старое заканадаўства, калі адносіны не закраналі інтарэсы імперыі і не былі прама накіраваны супраць яе. Але, нягледзячы на захаванне мясцовай судовай сістэмы, абскарджванне яе рашэнняў у апеляцыйным парадку ажыццяўлялася ў агульнарасійскіх установах. Апошняе сведчыць аб тым, што ўказаныя акты ўсё ж утрымлівалі комплекс мер, якія былі закліканы забяспечыць працэс інкарпарацыі зямель, якія адышлі ад Рэчы Паспалітай у склад Расійскай імперыі. Асабліва гэта бачна ў п. 6 указа ад 16 жніўня 1772 г., у якім падкрэслівалася, што судовыя справы павінны разглядаць мясцовыя суды па іх старым заканадаўстве, але ўжо ад імя расійскай імператрыцы. Першыя наказы Кацярыны II прадпісвалі карыстацца пры разглядзе судовых спраў мовай мясцовага насельніцтва таму, што інакш расійскія ўлады аб'ектыўна не маглі паступіць, а гарадам пакідалі іх правы і прывілеі. Хаця насамрэч пасля далучэння да Расіі гарады Беларусі згубілі той высокі статус, які мелі паводле магдэбургскага права. Іх саслоўныя выбарныя органы – магістраты – апынуліся пад моцным кантролем губернатараў і падпарадкаваных ім чыноўнікаў1. Разам з тым Бентам звяртае ўвагу на бессістэмнасць, заблытанасць, складанасць для ўспрымання расійскага заканадаўства ў цэлым і асобных прававых норм у прыватнасці. Пра навуковую смеласць іглыбіню пагружэння ўтэматыку правазнаўства ідзяржавазнаўства сведчаць і іншыя праблемныя пытанні, якія цікавілі вучонага. Так, напрыклад, з пазіцыі юрыдычнага пазітывізму ён падвяргае крытыцы натуральнае права, лічыць яго непераканаўчым, таму што яго змест няпэўны і можа тлумачыцца па-рознаму. Мысліцель прызнаваў рэальным толькі тое права, якое ўстаноўлена дзяржавай – сукупнасць законаў (загад суверэна), выдадзеных ці ўхваленых ёю для рэгулявання класа асоб, якія знаходзяцца пад яе ўладаю. З яго пункту гледжання, супрацьпастаўленне права закону з'яўляецца найвялікшым ворагам розуму і самым страшным разбуральнікам дзяржавы. Мяркуючы, што закон – мера палітычная, правазнаўца бачыць адрозныя нюансы паміж палітыкай і мараллю: першая «кіруе дзеяннямі ўрадаў, другая – учынкамі пэўных асоб; але мэта іх адна і тая ж – шчасце. Тое, што палітычна добра, не павінна быць маральна блага». Адсюль, будынак грамадскага жыцця, на думку Бентама, павінен быць узведзены рукамі розуму і закона на падставе яго вучэння аб карысці. Таму сваёй мэтаю ён лічыў распрацоўку такой сістэмы заканадаўства і прымяненне такіх норм маралі, якія змогуць знішчыць самавольства ў прававой галіне і даць людзям адчуваць сябе гаспадарамі ў сваёй дзяржаве. Значную ўвагу Бентам надаваў заканадаўчай тэхніцы, яго нават называлі Ньютанам заканадаўства. Пасля ад'езду з Беларусі ў працы «Тактыка заканадаўчых сходаў», падрыхтаванай па выніках назірання за працай палітычных устаноў Францыі, ён звяртае ўвагу заканадаўцаў на пэўныя недахопы пры распрацоўцы законапраектаў і прапаноўвае іх паляпшэнне з пункту

гледжання юрыдычнай тэхнікі: а) сцісласць тэкстаў артыкулаў закона, б) прастата палажэнняў, в) поўнае выкладанне ўсіх частак закона, г) яснае выражэнне дзяржаўнай волі. Асноўным патрабаваннем да мовы закону для вучонога-прававеда была яго даступнасць для разумення кожным індывідам, ад якога чакаецца выкананне закону. «Не патрэбна… рабіць законы дробнымі, складанымі і цёмнымі. Ёсць больш высокая вартасць закона – сцісласць і прастата». Найважнейшым сродкам надання якасці і стройнасці сістэме норм Бентам лічыў кадыфікацыю заканадаўчых актаў. У сваёй працы «Агульны погляд на поўны кодэкс законаў» ён падвяргае рэзкай крытыцы бессістэмнасць англійскага права і выказвае, на нашу думку, вельмі радыкальны погляд на паняцце кадыфікацыі, якую ён разглядае ў якасці канчатковага і вычарпальнага віда заканадаўства. «Тое, чаго няма ў кодэксе законаў, не павінна быць законам», – заяўляў ён. Не згаджаючыся з такой пазіцыяй, Э. Анерс справядліва кажа: «Але ж Бентам не думаў, што неабходна ўлічваць бясконцы лік спецыяльных выпадкаў і рэгуляваць іх пры дапамозе казуістычных правіл…». На думку вядомага прадстаўніка сучаснага пазітывізму Харта, Бентам сваім аналізам логікі мыслення і мовы права прадбачыў сучасную аналітычную юрыспрудэнцыю, а сваёй барацьбой за «дэмістыфікацыю права» зрабіў унёсак у спрашчэнне і правільнае прымяненне прававых паняццяў. У пытаннях крымінальнага права Бентам зыходзіў з досведу сваіх папярэднікаў, у першую чаргу Ч. Бекарыя. Яго ўвагай «не абдзелены ні адзін інстытут крымінальнага права. Услед за вялікім італьянцам, зыходзячы з прынцыпу карыснасці, Бентам лічыў, што заканадаўца павінен турбавацца больш аб папярэджванні злачынстваў, чым аб пакаранні іх… заканадаўства павінна больш выпраўляць, чым знішчаць. Гэтага можна дасягнуць палітычнымі і прававымі рэформамі ліберальнага толку». Верны свайму прынцыпу класіфікацыі і сістэматызацыі прававых паняццяў, спрашчэння і правільнага іх выкарыстання ён, па сутнасці, вызначыў пануючыя ў сучаснай дактрыне крымінальнага права і крымінальнага закона «канстытуцыйныя прыкметы злачынства: грамадская небяспека, супрацьпраўнасць, каральнасць; скрупулёзна даследаваў такія элементы складу злачынства, як аб’ектыўны і суб’ектыўны бакі; указаў на мэты пакарання: кампенсацыя шкоды, папярэджванне злачынстваў, выпраўленне злачынцы, кара (у якасці пабочнай мэты). Пры гэтым меркаваў, што пакаранне ёсць зло і мэта яго ёсць скасаванне якога-небудзь большага зла, таму яно не павінна быць дапушчальна: 1) калі пакаранне не абгрунтавана; 2) несапраўднае; 3) непрыбытковае; 4) непатрэбна». Павучальныя думкі мысліцеля аб памілаванні. Ён лічыў, што ў цывілізаваным грамадстве права памілавання становіцца параўнальным дабром (благом). Аднак яно перастае быць актам міласэрнасці, калі гаворка ідзе аб злачынстве супраць грамадства. У тых выпадках, калі пакаранне зрабіла б больш зла, чым дабра (пасля паўстанняў, грамадскіх беспарадкаў і інш.) памілаванне ёсць не парушэнне, а выкананне закона. Таму яно не толькі карысна, але нават неабходна, і не скарыстацца ім – прамое парушэнне манархам свайго абавязку. Выключэнне складае забойства. Разам з тым як

геній логікі Бентам раптам робіць наступнае заключэнне: «Калі законы вельмі суровыя, права памілавання ёсць неабходнае іх выпраўленне, але ж гэтае выпраўленне ёсць усё ж такі зло. Зрабіце добрыя законы і не рабіце магічнага жазла, якое мае сілу знішчыць іх. Калі пакаранне неабходна, яго адмяняць не патрэбна, а калі яно не неабходна, яго не патрэбна прызначаць». Бентам не толькі ўважліва прыслухоўваўся да патрабаванняў дзяржаўна-арганізаванага грамадства, займаўся не толькі прапагандай сваіх рэфарматарскіх поглядаў і тэорый, але і шукаў магчымасці ўкараніць іх у жыццё. Таму са сваімі праектамі ён звяртаўся да ўрадаў многіх краін свету. Так, напрыклад, пасля прызнання Англіяй у 1783 г. незалежнасці ЗША стала няма куды высылаць злачынцаў, тады Бентам прапанаваў ураду сваёй краіны замяніць высылку і плавучыя турмы паноптыкумам, праект якого быў ім распрацаваны ў час знаходжання ў былым Крычаўскім старостве. Паноптыкум прадугледжваў абавязковую працу арыштанцкіх арцеляў, якія карысталіся некаторай ступенню самакіравання, але пад пастаянным кантролем, строгім і нябачным наглядам турэмнай адміністрацыі. Бентам мэту зняволення бачыў у выпраўленні асуджаных праз працу як абавязковую ўмову адбывання пакарання, настойваў на праяўленні турботы пра здароўе вязняў, спалучэнне дабрыні і строгасці ў абыходжанні з імі. Адсюль дэвіз крычаўскага праекта – «міласэрнасць, справядлівасць, пільнасць». Бентам вялікую ўвагу надаваў палітычным рэформам. У прыватнасці, ім быў распрацаваны праект англійскай выбарчай рэформы, які ўключаў неабходнасць штогадовых выбараў, роўных выбарчых акругоў, шырокага выбарчага права і тайнага галасавання, рэлігійную цярпімасць і свабоду рэлігіі. Ён не адвяргаў права голасу жанчынам, але выключаў са складу выбаршчыкаў дарослых мужчын, якія не ўмелі чытаць, не плацілі падаткі, не пражывалі на працягу пэўнага часу ў пэўнай мясцовасці. Мысліцель быў прыхільнікам свабоды слова, аддзялення царквы ад дзяржавы, права на скасаванне шлюбу, забароны рабства, цялесных пакаранняў. Вялікую ўвагу надаваў Бентам удасканаленню працы апарата кіравання, лічыў неабходным увесці кантроль за ім з боку грамадскасці і заканадаўчых установ, экзамены для прэтэндэнтаў на пасады, вывучэнне іх маральных і дзелавых якасцей. Бентам звяртаўся да ўрада Францыі наконт адмены смяротнага пакарання, з прапановай лепшага ўпарадкавання парламенцкай дзейнасці і змянення судаўладкавання. Яго заслугі былі ацэнены і Дэкрэтам Нацыянальнага сходу Францыі 26 жніўня 1792 г. Бентаму разам з Вашынгтонам, Песталоцы, нашым суайчыннікам Касцюшкам і інш. падаравана французскае грамадзянства. Пазней аўтары французскага грамадзянскага Кодэкса карысталіся рэкамендацыямі Бентама, асабліва па прымяненні яго сінтэтычнага (абстрактнага) метада законатворчасці. Яго прынцып «найвялікшага шчасця», на падставе якога распрацавана канцэпцыя неад'емнага права людзей «на жыццё, свабоду і імкненне да шчасця», знайшоў месца ў Дэкларацыі аб незалежнасці ЗША, аўтарам якой быў Т. Джэферсан. Праз шмат гадоў пасля ад'езду з тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага Бентам напісаў расійскаму імператару Аляксандру I, што

за два гады ў Крычаўскім старостве атрымаў «самыя багатыя назіранні» ў сваім жыцці, моцныя ўражанні ад расійскай рэальнасці. Несправядліва называючы грамадзянскі кодэкс Францыі 1804 г., а з 1807 г.– Кодэкс Напалеона «ўсяго толькі хаосам», правазнаўца прапанаваў цару прыняць новае ўсеахопнае заканадаўства, якое будзе сфарміравана «быццам вакол цэнтральнай вежы», згодна з прынцыпам усеагульнай карысці5. Справа ў тым, што, прапаноўваючы свой удзел у падрыхтоўцы грамадзянскіх і крымінальных законаў, ён кіраваўся ідэяй адзінства грамадзянскага і крымінальнага права. У самым агульным плане Бентам вызначаў крымінальнае права як сукупнасць сродкаў, неабходных для ажыццяўлення і абароны мэтаў, намечаных нормамі грамадзянскага права. Калі нормы грамадзянскага права ўстанаўліваюць пэўныя правы і накладваюць пэўныя абавязкі на ўдзельнікаў дзяржаўнай супольнасці, то нормы крымінальнага закона клапоцяцца аб тым, каб устаноўленыя такім чынам правы і абавязкі былі абаронены ад парушэнняў, каб яны паважаліся і прызнаваліся ў якасці абавязковых. Невыпад кова ў першым томе «выбраных сачыненняў Іерамії Бентама» выдавец змясціў тры арганічна ўзаемазвязаныя паміж сабою трактаты: «Уводзіны ў асновы маральнасці і заканадаўства»; «Асноўныя пачаткі грамадзянскага Кодэкса»; «Асноўныя пачаткі крымінальнага Кодэкса». Па сутнасці, панаптычны звод законаў ніколі не быў ажыццёўлены, аднак, як сказана вышэй, яго ідэі паўплывалі на рэалізацыю палітыка-прававых пытанняў некаторых дзяржаў свету, прычым не толькі еўрапейскіх. Што тычыцца мары братоў Бентамаў аб ідэальнай турэмнай установе, то, нарадзіўшыся 236 гадоў таму на беларускай зямлі, яна перажыла і яе стваральнікаў, і расійскіх імператараў, і самаго Пацёмкіна. Адзначым і той факт, што падчас наведвання Расіі Сэмюэль Бентам усё ж арганізаваў такую ўстанову ў Пецярбурзе, на рацэ Охта. Яна называлася Панаптыч ным інстытутам і вырабляла навігацыйныя прыборы. Але неўзабаве будынак згарэў, і цяпер вядомы толькі па чарцяжах. Значна раней Іерамія спадзяваўся, што яго праектам зацікавіцца Кацярына II. У 1791 г. ён апублікаваў трактат «Паноптыкум», у якім ідзе гаворка аб рацы янальным уладкаванні турмаў на пачатках адзіночнага зняволення і цэнтральнага нагляду з адкрыццём неабходных майстэрняў, школ, бальніц з мэтаю выпраўлення і перавыхавання зняволеных. Але ў абсалютысцкай Расіі XVIII ст. ніхто не звярнуў увагу на яго працу. Не ўдалося ажыццявіць сваю мару аб пабудове ўзорнай турмы і ў сябе ў Англіі. Пасля вяртання з Крычава на радзіму Бентам набывае невялікі маёнтак у Гендоне, які знаходзіўся за восем міль ад Лондана і перасяляецца туды на сталае месца жыхарства. З Гендона пачынаецца той лад жыцця, які яму надоўга запомніўся па Беларусі: творчы, спакойны, манатонны, пазбаўлены знешніх стрэсаў, якому мысліцель застаўся адданы да самай смерці. Шведскі гісторык права Э. Анерс сцвярджае, што І. Бентам ніколі не карыстаўся папулярнасцю ў Англіі, «не стаў прарокам у сваёй айчыне, хаця стаў ім, ва ўсякім выпадку, на кантыненце. Там яго ўтылітарысцкая філасофія грамадства прыцягнула да сябе вялікую ўвагу і атрымала прызнанне» . Прааналізаваны творчы шлях

Бентама, яго навуковая спадчына дае падставу не пагадзіцца з меркаваннем Анерса аб тым, што ён не быў папу лярным у сябе на радзіме. Наадварот, мы прытрымліваемся ацэнкі І. Бентама прафесарам М. М. Азаркіным, які ў сціслай форме піша: «У пачатку XIX ст. Бентам лічыўся ледзьве не аракулам, да якога звярталіся дзяржаўныя дзеячы з просьбаю яго парады і карысталіся яго ідэямі ў праватворчасці. Ён і сам звяртаўся да народаў свету, прапаноўваючы ім свае паслугі… Яго вялікі ўплыў на юрыдычную думку адчуваўся, акрамя Англіі і яе калоній, асабліва ў тых краінах (Расія, Іспанія, Партугалія, Грэцыя, Лацінская Амерыка), дзе не адбыліся буржуазныя рэвалюцыі, а таму актуальнай была рэформа феадальнага права».

Заключэнне

Такім чынам, крычаўскі перыяд у палітыка-прававой спадчыне І. Бентама з'яўляецца адным з самых плённых. За час знаходжання на Магілёўшчыне, якая не так даўно была часткаю Вялікага княства Літоўскага, ён падрыхтаваў важныя навуковыя працы, пра якія мы гаварылі вышэй. Рэальная палітыка-прававая рэчаіснасць, якую ён убачыў на стыку ўсходняй і заходняй еўрапейскіх цывілізацый, знайшла адлюстраванне і ў такіх яго творах, як «Раз важанне аб грамадзянскім і крымінальным заканадаўстве» і «Тактыка заканадаўчых сходаў». Даказана, што ідэі «Тактыкі заканадаўчых сходаў» былі пакладзены ў аснову дзейнасці многіх парламентаў свету, а ідэі «паноптыкума» (своеасаблівай папраўча-працоўнай установы) былі пакладзены ў аснову крымінальна-выканаўчай сістэмы Венесуэлы, Балівіі, Іспаніі, Партугаліі, некаторых штатаў ЗША і іншых дзяржаў. Нягледзячы на тое, што І. Бентам знаходзіўся ў маёнтку Задабрасць 20 месяцаў, яму так і не ўдалося сустрэцца ні з Кацярынай II, ні нават са святлейшым князем Пацёмкіным, які запрасіў яго ў Расію. Калі ўвесну 1787 г. Кацярына II у суправаджэнні двара, караля Рэчы Паспалітай і еўрапейскіх паслоў здзяйсняла паездку ў паўднёвыя рэгіёны Расіі, то па невядомых нам прычынах Бентам не паехаў у Крычаў і не прымаў удзел у сустрэчы імператарскай працэсіі. Думкі філосафа, якія выкладзены ў вышэйназваных працах, так і засталіся незапатрабаванымі дзяржаўнай элітай Расійскай імперыі канца XVIII ст. Але ў першай трэці XIX ст., сутыкнуўшыся з неабходнасцю рэфармавання мадэлі дзяржаўнага кіравання Расіі, мясцовага саслоўнага самакіравання, судовай сістэмы, а таксама з неабходнасцю сістэматызацыі расійскага заканадаўства, некаторыя прадстаўнікі дзяржаўнай эліты, у тым ліку А. Е. Чартарыйскі, М. М. Сперанскі, М. С. Мардвінаў усё ж звярнулі ўвагу на работы І. Бентама. Цікава адзначыць і той факт, што ў 1815 г. імператар Аляксандр I пры пасярэдніцтве Мардвінава выказаў гатоўнасць скарыстацца ведамі і вопытам англічаніна ў рэфармаванні прававой сістэмы Расіі, але Бентам адмовіўся сам, не будучы ўпэўненым у галосным абмеркаванні праблемных пытанняў крымінальнага і грамадзянскага заканадаўства. Складальнікі «Судовых статутаў» 1864 г. таксама запазычылі ідэі Бентама, нягледзячы на негатыўныя водгукі на трактат мысліцеля «Аб судаўладкаванні», які быў перакладзены на рускую мову ў 1860 г. Паводле сведчанняў сучаснікаў, яго вучэнне аказала пэўны ўплыў і на палітычныя

погляды дзекабрыстаў. Рабіліся спробы рэалізацыі ў Расіі і ідэі «паноптыкума», пра што мы гаварылі вышэй. Такая папраўча-працоўная ўстанова існуе да нашых дзён. Але ў практычнай дзейнасці турмы «Крыжы» (Кресты – А. В.) у Санкт-Пецярбурзе, пабудаванай па плане братоў Бентам, ніколі не ўлічваліся прынцыпы, у адпаведнасці з якімі павінна праходзіць перавыхаванне асоб, што адбывалі пакаранне. Расія, у сваю чаргу, таксама паўплывала на палітыка-прававыя погляды Бентама. Знаходзячыся ў маёнтку Задабрасць на працягу параўнальна доўгага часу, вывучаючы сацыяльную, эканамічную, палітычную і прававую рэальнасць, ён прыйшоў да высновы аб неабходнасці канстытуцыйнага замацавання грамадзянскіх і палітычных правоў і свабод чалавека незалежна ад яго саслоўнага становішча. Менавіта гэта, на думку І. Бентама, з'яўляецца першачарговай гарантыяй сацыяльнай абароненасці кожнага чалавека. Разам з тым неабходнасць павагі да правоў і свабод асобы, іх няўхільнае захаванне ёсць галоўны абавязак кожнага дзяржаўнага органа і чыноўніка. Як адзначалася намі, спроба штучнай перасадкі заходняй цывілізацыі на расійскую глебу пацярпела поўную няўдачу, што і павінна было здарыцца. Але для І. Бентама вандроўка ў Крычаў дала магчымасць праехаць праз усю Еўропу на заходнія рубяжы Расіі і ўзбагаціла яго жыццёвы досвед шэрагам новых уражанняў і звестак. І ўсё ж няглядзячы на тое, што некаторыя ідэі І. Бентама былі ацэненыя і рэцэпціраваныя асобнымі прадстаўнікамі дзяржаўнай эліты Расійскай імперыі, найбольш спрыяльны момант для магчымага доўгага і плённага супрацоўніцтва мысліцеля і расійскай палітычнай эліты быў упушчаны разам з ад'ездам тэарэтыка ўтылітарызму з Расіі ў лістападзе 1787 г. І гэта нягледзячы на тое, што некаторыя сачыненні Бентама з'явіліся ўжо ў самым пачатку XIX ст. у «С-Пецярбургскім часопісе», была апублікавана на рускай мове манаграфія «Разважанні аб грамадзянскім і крымінальным законапалажэнні» (СПб, 1805. Т. 1., 1806. Т. 2) і інш. Пазней выйшлі «Уводзіны ў асновы маральнасці і заканадаўства» (СПб, 1867), «Тактыка заканадаўчых сходаў» (СПб, 1907). З метадалагічнага пункту гледжання многія разважанні Бентама па заслугах могуць быць успрыняты ў мэтах удасканалення прававога жыцця сучаснай Беларусі, у тым ліку ў галіне крымінальнага заканадаўства, у якім яго ідэі сугучны пастулатам класічнай школы крымінальнага права. Яго аўтарытэтная думка пры даследаваннях тэарэтыка-прававых і дзяржаўна-прававых праблем, галін права, у тым ліку міжнароднага права, адрозніваецца накіраванасцю на абнаўленне і гуманізацыю заканадаўства, павышэнне яго эфектыўнасці, што мела вялікае значэнне. Развітая ім філасофія карыснасці, што разумелася як мэта і крытэрый эканамічных паводзін, стала адной з асноў эканамічнай тэорыі XIX–XX стст. Можна сцвярджаць, што тэарэтычныя напрацоўкі І. Бентама выліліся ў адмысловае вучэнне – дэанталогію, ці навуку аб маралі. На думку мысліцеля, яго ўнікальныя рэцэпты лячэння чалавечага грамадства ад уласцівых яму сацыяльных хвароб павінны былі ў корані змяніць яго прыроду, прывесці свет да гармоніі і дабрабыту. А так як грамадства, у разуменні Бентама, – гэта механічны агрэгат індывідаў, то лагічна, што

ўсеагульнае шчасце можа быць дасягнута толькі шляхам клопату кожнага аб самім сабе. Таму ён лічыў, што адзіна магчымымі каштоўнымі інтарэсамі могуць быць толькі індывідуальныя інтарэсы, якія атаясамліваліся ім з карысцю, выгадай. Аналізуючы рэаліі свайго часу і ў асаблівасці пасля марных спроб рэалізаваць свае задумкі на практыцы, Бентам вымушаны быў канстатаваць, што на справе мэтай дзяржаўнай эліты становіцца ўстанаўленне найбольшага шчасця для тых, хто кіруе, хто ажыццяўляе ўладу ў краіне. З цягам часу ён з памяркоўнага кансерватара становіцца прыхільнікам прадстаўнічай дэмакратыі як найбольш дасканалай формы кіравання і прысвячае гэтай форме шэраг даследаванняў. Апошнія насілі хутчэй практычны і нават прыкладны характар: аб тактыцы заканадаўчых сходаў; палітыцы дзяржаўных узнагарод; патрабаваннях да ідэльнай турэмнай установы; пытаннях памілавання; праблемах юрыдычнай тэхнікі; класіфікацыі і сістэматызацыі прававых паняццяў і інш. Абвясціўшы асновай маральнасці і крытэрыем чалавечых учынкаў выключна карысць, Бентам не толькі трымаўся гэтага пераканання ўсё жыццё, але і не жадаў здраджваць сабе пасля смерці. Свае ўнутраныя органы ён завяшчае скарыстаць для медыцынскіх мэтаў, а шкілет захоўваць, «апрануўшы ў прыстойнае адзенне». І да нашага часу шкілет мысліцеля апрануты ў яго асабісты касцюм і ўвенчаны пасмяротнай васковай маскай, гасцінна сустракае студэнтаў Універсітэцкага каледжа ў Лондане.

Спіс выкарыстаных крыніц.

1. Азаркин, Н. М. Всеобщая история юриспруденции: курс лекций / Н. М. Азаркин. – М.: Юрид. лит., 2003. – 608 с.

2. Аннерс, Э. История европейского права (пер. со швед.) / Э. Аннерс; Ин-т Европы. – М.: Наука, 1996.– 395 с.

3. Баканов, А. А. Бентам / А. А. Баканов // Новейший философский словарь. – 3-е изд., исправ. – Минск: Книжный Дом, 2003.– С. 87

4. Бентам, И. Избранные сочинения: в 3 т. / И. Бентам; пер. А. Н. Пыпина, А. Н. Неведомского по англ. изд. Боуринга и французскому Дюмона; предисл. Ю. Г. Жуковского. – СПб.: Русская книжная торговля, 1867. – Т. 1: Введение в основание нравственности и законодательства. Основные начала гражданского кодекса. Основные начала уголовного кодекса. – 678 с.

5. Бентам, И. Тактика законодательных собраний / И. Бентам; пер. М. К.– СПб.: Изд-во Л. А. Волихова, 1907. – 188 с.

6. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (Са старажытных часоў да нашых дзён): вучэб. дап. / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо; пад агул. рэд. А. Ф. Вішнеўскага. – 2-е выд. – Мінск: Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2003. – 320 с.

7. В і ш н е ў с к і , А . Ф . К р ы ч а ў с к і п е р ы я д у палітыка-прававой спадчыне Іерамії Бентама / А. Ф. Вішнеўскі // Право.by. – 2020. – № 3.– С. 7–13.

8. Графский, В. Г. История политических и правовых учений: учебник / В. Г. Графский. – 2-е изд., перераб. и доп.– М.: ТК Велби, Проспект, 2007.– 608 с.

9. Законодательство Екатерины II: в 2 т. / отв. ред. О. И. Чистяков, Т. Е. Новицкая. – М.: Юрид. лит, 2000. – Т. 1.– 1056 с.

10. Мельников, А.П. Исторические этапы становления и развития политических теорий и учений / А. П. Мельников, С. Ф. Сокол. – Минск: БИП-С Плюс, 2011. – 208 с.

11. Остроух, А. Н. О понятии договора и принципе свободы договора в правовом учении И. Бентама / А. Н. Остроух // История государства и права. – 2004. – № 5.– С. 13–15.

12. Покровский, П. А. Бентам и его время / П. А. Покровский. – Петроград: Тип. А. Э. Коллинс, 1916. – 704 с.

13. Савюк, Л. К. Портреты ученых-юристов: Иеремия Бентам / Л. К. Савюк // Философский век. Альманах. Вып. 9. Наука о морали: Дж. Бентам и Россия / отв. ред. Т. В. Артемьева, М. И. Микешин.– СПб., 1999.– С. 19–38.

14. Энциклопедический словарь Ф. А. Брокгауза и И. А. Эфрона. Биографии: в 5 т.– Москва: Большая Российская энциклопедия, 1992.– Т. 2.– 832 с.

15. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / Г. П. Пашкоў (гал. рэд) [і інш.].– Мінск: БелЭн, 1997.– Т. 4.– 432 с.

16. Щербик, Д. В. Дискретность и преемственность в развитии права Беларуси: дис. … канд. юрид. наук: 12.00.01 / Д. В. Щербик; Белорус. гос. ун-т.– Минск, 2009.– 138 с.

Дата паступлення ў рэдакцыю 29.08.2022